# Слоўнік асабовых уласных імён

Навука і тэхніка

АКАДЕМИЯ НАУК БССР
ИНСТИТУТ ЯЗЫКОЗНАНИЯ им. ЯКУБА КОЛАСА

# СЛОВАРЬ личных собственных имен

*Составитель*
***М. Р. СУДНИК***

МИНСК 1965

АКАДЭМІЯ НАВУК БССР
ІНСТЫТУТ МОВАЗНАЎСТВА імя ЯКУБА КОЛАСА

# Слоўнік асабовых уласных імён

*Укладальнік*
***М. Р. СУДНІК***

МІНСК 1965

Гэты слоўнік мае на мэце даць па магчымасці поўнае ўяўленне аб уласных асабовых імёнах, якімі ў сучасны момант шырока карыстаецца беларускі народ. Разам з тым слоўнік прызначаецца ў якасці даведніка па такіх пытаннях, як адрозніваць гутарковую форму ад афіцыяльнай формы імя, поўную ад скарочанай, як правільна ўжываць тое ці іншае імя ў жывой мове і ў разнастайнай пісьмовай дакументацыі: пасведчаннях аб нараджэнні, пашпартах, ваенных і партыйных дакументах, паштовых адрасах і іншых паперах афіцыяльнага характару.

Слоўнік спатрэбіцца настаўнікам, працаўнікам друку, радыё, ЗАГСам, пашпартным сталам, аддзелам юрыдычнай кансультацыі і іншым установам.

# ПРАДМОВА

## МЭТЫ І ЗАДАЧЫ СЛОЎНІКА

Уласныя імёны людзей складаюць асобную, даволі вялікую катэ-орыю слоў, якія ўстойліва бытуюць у грамадстве, пастаянна пера-одзячы ад пакалення да пакалення, ад аднаго народа да другога.

Трапляючы з аднаго моўнага асяроддзя ў другое, уласныя імёны а працягу доўгага часу ўжывання асвойваюцца паводле законаў ювы і вымаўленчых норм таго народа, які запазычае іх. І цяпер, апрыклад, не кожнаму лёгка ўявіць сабе, што рускае імя *Іван*, юльскае *Ян*, армянскае *Аванес*, грузінскае *Вано*, фінскае *Юхан*, ня-іецкае *Ганс*, французскае *Жан*, англійскае *Джон* паходзяць ад ельмі непадобнага да іх старажытнаяўрэйскага імя *Йоханаан*.

Так і сучасныя беларускія імёны ўвайшлі ў лексічны склад на-пай мовы праз візантыйскія кнігі, асіміляваліся тут, набылі нацыя-альную афарбоўку і ўспрымаюцца кожным як свае ўласныя. Дзя-уючы гэтаму побач з традыцыйнай кніжнай формай імён *Аркадзій*, *Васілій, Грыгорый, Пракофій, Сафроній* мы зараз маем у афіцыяль-ым звароце ўзаконеныя звычаем народнага іменавання формы *Ар-адзь, Васіль, Рыгор, Пракоп, Сафрон* і інш.

Хоць асабовыя імёны ўваходзяць у лексічны фонд мовы як яго астаўная частка, аднак яны многімі сваімі рысамі адрозніваюцца д усіх іншых слоў. Ужо адзін той факт, што ўсякае ўласнае імя 'яўляецца словам, але не кожнае слова можа выступаць у якасці ласнага імя, вылучае гэты разрад слоў з агульнага лексічнага сас-аву ў спецыяльны наменалагічны разрад, вывучэннем якога займа-цца асобны раздзел мовазнаўства — антрапаніміка.

З адзначанага відаць, што асабовыя імёны — справа не стольк асабістая, колькі грамадская, бо без іх ні аднаго дня не абыхо дзіцца ні сям'я як грамадская ячэйка, ні грамадства ў цэлым з яг разнастайнымі сферамі дзейнасці. У сувязі з гэтым, здавалася б, ўвага да ўласных імён з боку навукі павінна была быць асаблівай Аднак, як ні дзіўна, антрапаніміка, у тым ліку і беларуская, з'яў ляецца найменш распрацаваным раздзелам у мовазнаўстве. Аб гэ тым сведчыць той факт, што за мінулае шасцідзесяцігоддзе ў Бела русі з'явілася толькі дзве спецыяльныя працы аб уласных імёнах артыкул М. Я. Грынблата пад назвай «Анамастыка як крыніца вы вучэння гісторыі і этнаграфіі беларускага народа» і брашура М. Бірылы «Беларускія антрапанімічныя назвы ў іх адносінах да антрапанімічных назваў іншых славянскіх моў».

Што да практычных пытанняў беларускай наменалогіі, то яны калі не лічыць невялікага раздзела ў кнізе «Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі», прысвечанага правапісу ўласных імён прозвішчаў, да гэтага часу не атрымалі належнага асвятлення. Не існуе пакуль што і звычайных даведнікаў, якія б змяшчалі рэкамен дацыйныя спісы прынятых сучасным грамадствам імён, дапамагал ў адрозненні іх афіцыяльнай формы ад народна-гутарковых варыян таў, садзейнічалі правільнаму вымаўленню і напісанню.

Без такіх даведнікаў цяжка забяспечыць неабходную аднастай насць ва ўжыванні асабовых імён у розных відах пісьма і вуснай практыцы. У выніку часта ў асабістыя дакументы трапляюць скаро чаныя ці нават гутарковыя формы імён, якія не атрымалі юрыдычнага прызнання. Па той жа прычыне ў шырокі зварот і нават у афіцы яльныя публікацыі пранікаюць двоякія, а то і проста арфаграфічна памылковыя напісанні дадзенай катэгорыі слоў.

Усё гэта яскрава паказвае, што справа нармалізацыі асабовых імён перарасла рамкі прыватнага пытання і ператварылася ў задачу шырокага грамадскага значэння.

Для таго каб хоць у нейкай меры дапамагчы вырашэнню дадзе най задачы, а разам з тым садзейнічаць папулярызацыі правільнага ўжывання нашых імён у іх афіцыяльнай форме, і складаўся гэты першы ў беларускай лексікаграфіі «Слоўнік асабовых уласных імён».

# КРЫНІЦЫ СЛОЎНІКА

Асновай для ўкладання слоўніка служылі шырока бытуючыя ў асяроддзі беларускага народа ўласныя імёны людзей. Аднак вывучэнне гэтага разраду лексікі паказала, што не ўсе ўласныя імёны ў аднолькавай ступені пашыраны. Адны з іх сустракаюцца вельмі часта, другія на дзесяткі населеных пунктаў трапляюцца адзін раз, іншыя ж зусім адышлі ў мінулае, і мы пра іх даведваемся толькі з пісьмовых помнікаў ці з прозвішчаў, якія ўтварыліся на аснове такіх імён. Заўважана, што не атрымалі колькі-небудзь значнага распаўсюджання цяжкія для вымаўлення старасвецкія каляндарныя імёны тыпу *Асклініядот, Ексакустадзіян, Параліпамянон; Арэапагіта, Яўтропія*. Іх носьбітамі з'яўляюцца выключна людзі старога пакалення, якім імёны ў дарэвалюцыйны час даваліся не па жаданню бацькоў, а па патрабаванню традыцыйнага царкоўнага месяцаслова.

Непапулярны ў народзе і тыя імёны, ад якіх не ўтвараюцца зусім або цяжка ўтвараюцца ласкальныя формы, у сувязі з чым, адзначае прафесар В. І. Чарнышоў, іх нельга наблізіць да калыскі маці, немагчыма вымаўляць лёгка, пявуча, з душэўнай цеплынёй і пяшчотнасцю. Відаць, па гэтай прычыне параўнальна рэдка ўжываюцца імёны *Анцівох, Горгій, Дармідонт; Ганарата, Мадзеста, Яўлампія*.

Немалаважным фактарам, ад якога залежыць ступень распаўсюджанасці таго ці іншага імя, з'яўляецца мілагучнасць і прыгажосць. І калі нячаста сустракаюцца сярод мужчынскіх імён *Вавілы, Равулы, Пуды, Сысоі*, а сярод жаночых *Епіхарыі, Калерыі, Праскудзіі, Хрысы*, то ў гэтым, бясспрэчна, вінавата іх не надта далікатнае гучанне і вельмі празрыстая магчымасць для непажаданых асацыяцый і мянушак.

Не прыжыліся на шырокай народнай глебе і некаторыя новыя імёны індывідуальнага ўтварэння, якія ўзніклі ў першыя паслякастрычніцкія гады, калі стала магчыма даваць імёны незалежна ад царквы. Такімі сведкамі новага іменаслоўя з'яўляюцца: *Барзамір, Рэўдзіт, Рэўмір; Давянара, Мюда, Юнарма* і інш.

Затое колькі словатворчай вынаходлівасці ўкладзена народам у гутарковыя формы ад папулярных імён, такіх, як *Аляксандр, Васіль, Іван, Канстанцін, Міхаіл, Пётр, Сяргей, Уладзімір; Агрыпіна, Валянціна, Ганна, Еўдакія, Кацярына, Марыя, Таццяна, Фядосся* і інш. Прычым у гэтых формах адлюстроўваецца не толькі ўзроставая дастасаванасць імён, але характар саміх адносін да носьбіта таго ці іншага імя з боку гаворачай асобы. Параўнай: *Пётр, Пётра, Пятро, Пятраш, Пятрусь, Петрусёк, Пятруха, Пятруша, Пятрушка, Пятрашык, Пятруня, Пятрунька, Пятруньчык, Петрык, Пятрок, Петрачок, Пётрачка, Пеця, Пецька, Пецечка* і інш. Па далёка няпоўнаму ўліку ў народзе бытуе звыш 20 гутарковых варыянтаў гэтага імя. А яно не самае багатае на формы. Значна большай варыянтнасцю, напрыклад, вызначаецца жаночае імя *Агрыпіна,* ад яго ўтворана і існуе звыш 40 асобных форм. Наогул народна-гутарковыя імёны надзвычайна разнастайны па сваіх словаўтваральных сродках. Адзіных і сталых мадэлей тут няма. Кожнае імя — новая, непаўторная структура. І якім вялікім укладам у беларускую наменалогію быў бы такі слоўнік, які б ахопліваў усе без выключэння існуючыя ў народзе варыянты імён. Але стварэнне падобнага слоўніка — справа складаная. Для ажыццяўлення яе неабходна было б абследаваць народнае іменаслоўе на ўсёй тэрыторыі Беларусі.

Улічваючы неабдымнасць такой задачы і неажыццявімасць яе ў кароткі тэрмін, вырашана было пры складанні дадзенага слоўніка кіравацца не шырокімі навуковымі мэтамі, а, як ужо адзначалася, надзённымі практычнымі патрэбамі.

Гэта дазволіла ўхіліцца ад дадатковага збірання так званых няпоўных або скарочаных імён і шматлікіх памяншальна-ласкальных форм ад кожнага імя. І калі выключэнне ўсё ж зроблена, то толькі для тых імянных форм, якія зараз ужо не ўспрымаюцца як памяншальныя, напрыклад *Алесь, Міхась, Пятрусь* і інш.

Але і пры такім абмежаванні слоўнікавага складу праблема выяўлення і збірання ўласных асабовых імён заставалася нялёгкай. Вырашэнне яе ўскладнялася тым, што ў Беларусі ў свой час атрымалі распаўсюджанне дзве сістэмы іменаслоўя: ва ўсходняй частцы — праваслаўная, візантыйска-грэчаская, а ў заходняй — рымска-

каталіцкая. Па традыцыі гэтыя сістэмы суіснуюць і зараз, утвараючы два рады ўласных імён. З аднаго боку, асноўны, шырокі слой імён старажытнагрэчаскага паходжання, як *Андрэй, Васіль, Генадзь, Дзмітрый, Ерафей, Кузьма, Мірон, Нікадзім, Пётр, Сцяпан, Тарас, Філімон, Яўхім*; *Анісся, Вераніка, Галіна, Ефрасіння, Лідзія, Пелагея, Раіса, Софія, Таццяна, Хрысціна,* з другога ж — даволі значны пласт рымска-каталіцкіх імён тыпу *Адольф, Бярнард, Вітольд, Зянон, Людвіг, Рамуальд, Сігізмунд, Фабіян, Эдуард*; *Альбіна, Ванда, Генавефа, Міхаліна, Францішка, Юзэфа, Ядвіга* і інш.

Да таго ж адна і другая іменаслоўныя сістэмы, функцыяніруючы ў грамадстве, папоўніліся разнастайнымі гутарковымі варыянтамі імён. У выніку з'явілася па сутнасці трэцяя імянная сістэма, якую можна было б назваць сістэмай народнага беларускага іменаслоўя. Асаблівасць складу гэтай сістэмы і яе словаўтваральных сродкаў лепш за ўсё характарызуюць самі належачыя да яе імёны. Параўнай: *Андрос (Андрэй), Базыль (Васіль), Вінцэсь (Вінцэнт), Гальяш (Ілья), Домант (Дамеціян), Зыгмусь (Сігізмунд), Кастусь (Канстанцін), Маўрыяш (Маўрыкій), Прокша (Пракоп), Сяліўка (Селівон), Шабоста (Севасцьян), Яўтух (Яўціхій)*; *Алеся (Аляксандра), Барбара (Варвара), Гунэта (Генавефа), Зося (Софія), Лікера (Лукер'я), Параска (Праскоўя)* і інш.

На першы погляд можа паказацца, што тып адзначаных імён не мае непасрэдных адносін да нарматыўнага слоўніка, падобна да таго, як не адносяцца да такога слоўніка і іншыя гутарковыя варыянты асабовых імён (скарочаныя, памяншальна-ласкальныя), якія сапраўды не падлягаюць якой-небудзь нармалізацыі. Але гэта толькі на першы погляд. Больш грунтоўнае азнаямленне паказвае, што дадзены разрад імён значна шырэй, чым іншыя, функцыяніруе ў грамадстве, у прыватнасці, яго як яркі жывапісны сродак неабмежавана выкарыстоўвае мастацкая літаратура, якая, замацоўваючы такія імёны пісьмова, спрыяе іх нармалізацыі. Другой важнай асаблівасцю гэтых імён з'яўляецца тое, што яны паслужылі адной з асноў для ўзнікнення трэцяга ў нашым іменаслоўі наменалагічнага яруса — прозвішчаў (першы ярус складаюць імёны, другі — імёны па бацьку).

Што гэта сапраўды так, сведчаць наступныя беларускія прозвішчы: *Атраховіч* (параўнай гутарковае *Атрох* і афіцыяльнае *Трафім), Бастун (Басцей* і *Васіян), Грынчык (Грынь* і *Рыгор), Ермаловіч (Ярмол* і *Ермалай), Ладысік (Ладысь* і *Уладзімір), Міхневіч* (*Міхно* і *Міхей*), *Пархімчык* (*Пархім* і *Парфен*), *Рахцеенка* (*Рахцей* і *Ерафей*), *Супрунюк (Супрун* і *Сафрон), Хадасевіч (Хадась* і *Фадзей), Церахаў (Церах* і *Цярэнцій), Чурылаў (Чурыла* і *Кірыла), Юхневіч (Юхно* і *Юрый), Ясінскі (Ясь* і *Іван)* і інш.

Тут для ілюстрацыі прыведзены толькі адзінкавыя прозвішчы, утвораныя ад таго ці іншага гутарковага імя, на самай жа справе ад кожнага такога імя адгаліноўваюцца цэлыя групы разнастайных па свайму афармленню прозвішчаў. Напрыклад, гутарковае імя *Ярох (Ерафей)* з'явілася асновай для ўзнікнення такіх прозвішчаў, як *Яроха, Ярош, Ерах, Ерахавец, Ераховіч, Ерахаў, Ерашэвіч, Ерашэўскі, Ерашынскі, Ерашкевіч, Ерашэня, Ерашэнка, Ерашонак, Ерашук, Ерашоў* і інш.

А паколькі прозвішчы ў адпаведнасці з уласцівай ім грамадскай функцыяй патрабуюць дакладнасці пры перадачы на пісьме, то зусім натуральна, каб і звязаныя з імі гутарковыя варыянты імён захоўвалі пэўную арфаграфічную аднастайнасць. Дапушчэнне разыходжанняў было б нелагічным і зніжала б культуру пісьмовай мовы. Гэта акалічнасць і з'явілася падставай для ўключэння гутарковых форм імён у слоўнік, нягледзячы на яго нарматыўны характар.

Прымалася пад увагу і яшчэ адно меркаванне. Аўтар лічыў, што падача гутарковых варыянтаў уласных імён у тэксце слоўніка будзе больш ярка адцяняць афіцыяльную форму імя і тым самым засцерагаць ад памылковага ўжывання гутарковых імён замест афіцыяльных у дакументах і разнастайных паперах юрыдычна-дзелавога характару.

Крытэрый сучаснасці і крытэрый практычнасці слоўніка вымушалі пры адборы імён для яго кіравацца не ўстарэлымі імяннымі рэестрамі царкоўных месяцасловаў і грамадзянскіх календароў, а навейшымі матэрыяламі, якія адлюстроўваюць жывую народную традыцыю ў беларускім іменаслоўі.

Такімі невычэрпнымі дакументальнымі крыніцамі з'явіліся пад-

ворныя рэгістрацыйныя лісты жыхароў Беларусі, складзеныя ў час перапісу насельніцтва ў 1959 годзе. Аднак па зразумелай прычыне праглядзець ад першага да апошняга ўсе лісты перапісу, якія ахопліваюць больш 8 мільёнаў чалавек, не было магчымасці. Таму прыйшлося абмежавацца абследаваннем 100 тысяч уласных імён, а ў якасці паказчыка пашыранасці таго ці іншага імя прыняць частотнасць яго ўжывальнасці 1 : 10 000. Гэты крытэрый даваў аб'ектыўную падставу лічыць імя пашыраным і ўключаць у асноўны рэестр слоўніка, калі на кожныя 10 тысяч мужчынскіх ці 10 тысяч жаночых імён яно сустрэлася не менш аднаго разу. Неадпавядаючыя такой частотнасці імёны адносіліся да ліку малапашыраных і змяшчаліся ў раздзел рэдкаўжывальных.

Некаторая колькасць уласных імён была сабрана ў працэсе азнаямлення са спісамі на выбарчых участках у перыяд апошніх выбараў і пры спецыяльным праглядзе рэспубліканскіх, абласных і раённых газет, на старонках якіх давялося сустрэць нямала сённяшніх новых імён, бытуючых у розных мясцінах Беларусі.

Асобную задачу складала збіранне народна-гутарковых форм імён. Для гэтага прыйшлося звяртацца да розных крыніц: «Могилевских губернских ведомостей» (1850 г.), Слоўніка І. І. Насовіча (1870 г.), рукапіснага слоўніка П. Шпілеўскага (1853 г.), рукапіснага «Беларускага слоўніка» С. Мядзведскага (1910 г.), рукапіснага «Расійска-беларускага слоўніка» А. В. Ярушэвіча (1914 г.), «Віцебскага краёвага слоўніка» М. Каспяровіча (1927 г.), «Матэрыялаў для слоўніка народна-дыялектнай мовы» (1960 г.) і да некаторых беларускіх часопісаў 1923 — 1928 гадоў, дзе можна было сустрэць нататкі пра імёны людзей і невялікія спісы ўласных імён.

Значная частка гутарковых варыянтаў імён укладальнікам слоўніка была атрымана ад мясцовых карэспандэнтаў з Брэстчыны, Гродзеншчыны, Міншчыны, Полаччыны і Случчыны.

Для даведачнага раздзела аб устарэлых асабовых імёнах, з якімі даводзіцца сустракацца ў разнастайных гістарычных помніках, выкарыстаны імянныя рэестры царкоўных месяцасловаў, спісы ўласных імён з дадаткаў да актавых кніг, «Лексікон» П. Бярынды (1627 г.), у якім другая частка спецыяльна прысвечана ўласным імё-

нам, тлумачэнню іх паходжання і значэння, а таксама «Славянский именослов» М. Марошкіна (1867 г.), «Словарь древнерусских личных собственных имен» Н. Тупікова (1903 г.) і іншыя крыніцы.

## СТРУКТУРА СЛОЎНІКА

Слоўнік складаецца з трох раздзелаў: беларуска-рускага і руска-беларускага, у якіх падаюцца найбольш пашыраныя сярод беларусаў уласныя асабовыя імёны незалежна ад іх паходжання. Тут побач з старажытнарускімі імёнамі, такімі, як *Барыс, Вадзім, Глеб; Вера, Любоў, Надзея,* і агульнымі для беларускага і польскага народаў імёнамі: *Баляслаў, Людвіг, Сігізмунд, Ванда, Францыска, Ядвіга* знаходзім прыйшоўшыя да нас разам з хрысціянствам імёны грэчаскага паходжання: *Андрэй, Васіль, Ермалай, Макар, Нікадзім, Панкрат, Сцяпан, Тарас, Феафіл*; *Галіна, Ефрасіння, Ксенія, Ларыса, Софія*; лацінскія імёны: *Віктар, Дзям'ян, Ігнат, Клімент, Лаўрын, Максім, Пракоп*; *Антаніна, Валянціна, Домна, Марына, Рэната*; старажытнаяўрэйскія па паходжанню імёны: *Адам, Гурый, Даніла, Захар, Іван, Міхаіл, Навум, Сямён*; *Ганна, Лізавета, Марыя, Серафіма*; імёны агульнаславянскага фонду: *Вячаслаў, Мсціслаў, Расціслаў, Уладзімір*; *Браніслава, Людміла, Мілана, Рагнеда, Святлана;* грузінскія: *Ніна, Тамара;* скандынаўскія: *Алег, Ігар; Вольга;* германскія: *Карл, Эдуард; Адэлаіда, Эма;* егіпецкія: *Ануфрый, Майсей; Нона, Таіса;* сірыйскія: *Вавіла, Марфа* і інш.

Трэці раздзел змяшчае ўстарэлыя, адышоўшыя ў нябыт кананічныя імёны і іх формы тыпу *Архістраціг, Варахісій, Сімяон, Фісаланікія,* а таксама новыя рэдкаўжывальныя імёны, напрыклад: *Ідэал, Навамір; Інтэрна, Трактарына* і інш. Прызначаецца трэці раздзел не для рэкамендацыі сабраных у ім імён, а для арфаграфічных і розных іншых даведак, якія могуць спатрэбіцца пры чытанні гістарычнай і мастацкай літаратуры мінулых эпох, а часам і для магчымага выкарыстання такіх імён у якіх-небудзь стылістычных мэтах.

Для зручнасці карыстання ў кожным з трох раздзелаў вылучаюцца і падаюцца асобна па алфавіту мужчынскія, а затым жаночыя

імёны. Правільнасць вымаўлення іх забяспечваецца пастаноўкай націску.

Усяго слоўнік змяшчае больш 2500 уласных імён. З гэтай колькасці сучасных шырокаўжывальных імён налічваецца звыш 1600 (прыкладна 1000 мужчынскіх і 600 жаночых), астатнія 900 імён адносяцца да ўстарэлых і рэдкаўжывальных (з іх каля 700 мужчынскіх і больш 200 жаночых).

Паколькі пры ўкладанні слоўніка ўстаноўка рабілася на нармалізацыю афіцыяльнай формы не толькі імён, але і імён па бацьку, то ў першым раздзеле для беларускіх імён, а ў другім для адпаведных рускіх паслядоўна вызначаюцца такія іменаванні па бацьку для мужчын і жанчын. Пры гэтым афіцыяльная форма імя ставіцца на першым месцы і вылучаецца чорным шрыфтам, а пасля яе прыводзяцца некаторыя найбольш ужывальныя народна-гутарковыя варыянты светлым шрыфтам у дужках і на сваім месцы ў рэестры са спасылкай на афіцыяльную форму, пры якой гэтыя варыянты адзначаны.

Адсылка да афіцыяльнай формы робіцца яшчэ ў тым выпадку, калі ранейшы варыянт імя з пункту гледжання нормы не лічыцца раўнапраўным з існуючым зараз новым варыянтам. Пры такіх імёнах даецца памета *гл. (глядзі)*, напрыклад: **Дзімітрый,** *гл.* Дзмітрый.

Некаторыя мужчынскія імёны ўвайшлі ў афіцыяльны зварот з дзвюма формамі — народнай і кніжнай. Таму ў беларускай дзелавой і юрыдычнай дакументацыі можна сустрэць напісанні *Васіль* і *Васілій, Даніла* і *Данііл, Рыгор* і *Грыгорый.* Якіх-небудзь падстаў для уніфікацыі такіх форм практыка не дае. З гэтай прычыны ў слоўніку падобныя формы адлюстроўваюцца як раўнапраўныя. Пры гэтым на першым месцы падаецца народная форма з утварэннем ад яе імя па бацьку для мужчын і жанчын, а затым праз злучнік *і* прыводзіцца кніжная форма таго ж імя, зноў-такі з адпаведным мужчынскім і жаночым імем па бацьку.

Этымалагічна блізкія імёны, якія ў мінулым утварыліся ад аднаго кораня, а затым адасобіліся і сталі ўспрымацца як самастойныя, у слоўніку прыводзяцца кожнае на сваім месцы па алфавіту і лічацца рознымі імёнамі. Прыкладам такіх імён з'яўляюцца: *Геор-*

*гій, Юрый, Ягор; Агапія, Агата, Агафія.* Але высвятленне таго, якія імёны звязаны паміж сабой адзінствам паходжання, у задачу слоўніка не ўваходзіла, і таму даведнікам па гэтаму пытанню ён служыць не можа.

Укладальнік слоўніка лічыў бы свой абавязак выкананым, калі б яго праца хоць у нейкай ступені задаволіла патрабаванні зацікаўленага чытача і спрыяла павышэнню агульнай культуры пісьма нашага народа. У той жа час ён добра разумее, што стварэнне падобнага даведніка не абыходзіцца без недахопаў, тым больш, калі такі даведнік падрыхтоўваецца пры адсутнасці папярэдняга вопыту.

Як можна прадбачыць, не ўсе аднолькава паставяцца да таго, што ў тэксце беларускай часткі слоўніка прыводзяцца дзве формы імён — афіцыяльная і гутарковая. Але зроблена гэта свядома і не для таго, зразумела, каб пагоршыць слоўнік. Аўтар перакананы, што гутарковыя імёны хоць і адрозніваюцца сваімі функцыямі ад афіцыяльных, аднак не складаюць нейкай якасна іншай рэальнасці, якая б давала падставу не ўводзіць іх у тэкст слоўніка.

Напэўна, будуць папрокі і за магчымыя пропускі бытуючых у Беларусі ўласных імён. У сувязі з гэтым застаецца сказаць адно: да ідэальнай паўнаты слоўніка можна толькі імкнуцца, але як бы ні стараўся аўтар ахапіць усё імяннoe багацце народа, заўсёды застанецца штосьці не ўлічаным, бо адразу абняць неабдымнае нельга.

Знойдуцца, відаць, і іншыя прэтэнзіі да ўкладальніка. І ўсё ж ён, ніколькі не прэтэндуючы на дасканаласць сваёй працы, адважыўся на яе друкаванне, спадзеючыся, што заўвагі чытачоў, іх добразычлівыя парады і прапановы дапамогуць у далейшым стварыць лепшы даведнік па ўласных імёнах.

У заключэнне аўтар лічыць сваім прыемным абавязкам выказаць шчырую падзяку акадэмікам К. К. Крапіве, П. Ф. Глебку і кандыдатам філалагічных навук М. В. Бірылу і М. П. Лобану за іх каштоўныя заўвагі, зробленыя пры чытанні рукапісу слоўніка, а Н. Д. Корань і В. П. Лемцюговай за практычную дапамогу ў падрыхтоўцы рукапісу да друку.

*Аўтар*

# БЕЛАРУСКА-РУСКАЯ ЧАСТКА

## МУЖЧЫНСКІЯ ІМЁНЫ

### А

**Абаку́м** (*разм.* Во́кум)
Абаку́мавіч, Абаку́маўна — Аввaку́м

**Абра́м** (*разм.* Абра́сь, Абру́к)
Абра́мавіч, Абра́маўна—Авра́м

**Абра́сь,** *разм., гл.* Абра́м

**Абру́к,** *разм., гл.* Абра́м

**Аваку́м,** *гл.* Абаку́м

**Аве́ркій**
Аве́ркіевіч, Аве́ркіеўна — Аве́ркий

**Авянір** (*разм.* Віну́сь)
Авяніравіч, Авяніраўна — Авени́р

**Авяр'я́н,**
Авяр'я́навіч, Авяр'я́наўна — Аверья́н

**Ага́п**
Ага́павіч, Ага́паўна — Ага́пий, Ага́п

**Агапіт**
Агапітавіч, Агапітаўна — Агапи́т

**Агапо́н,** *гл.* Агафо́н

**Агафо́н** (*разм.* Гапо́н, Гапія́н, Гапу́сь)
Агафо́навіч, Агафо́наўна — Агафо́н

**Аге́й**
Аге́евіч, Аге́еўна — Агге́й

**Адалю́к,** *разм., гл.* Адо́льф

**Ада́м** (*разм.* Ада́сь)
Ада́мавіч, Ада́маўна — Ада́м

**Ада́сь,** *разм., гл.* Ада́м

**Адо́льф** (*разм.* Адалю́к)
Адо́льфавіч, Адо́льфаўна — Адо́льф

**Адрыя́н**
Адрыя́навіч, Адрыя́наўна — Адриа́н

**Адуа́рд,** *разм., гл.* Эдуа́рд

**Аза́р**
Аза́равіч, Аза́раўна — Аза́рий

**А́ка́**

Акі́ч, Акі́нічна — Ока́

**Акзе́льм** (*разм.* Акзэ́льмусь)

Акзе́льмавіч, Акзе́льмаўна— Акзе́льм

**Акзэ́льмусь,** *разм., гл.* Акзе́льм

**Акі́м** (*разм.* Які́м, Ю́хша)

Акі́мавіч, Акі́маўна — Аки́м

**Акі́нф** (*разм.* Канці́сь, Яко́нт)

Акі́нфавіч, Акі́нфаўна — Иаки́нф

**Акса́йла,** *разм., гл.* Аўксе́нцій

**Аксён**

Аксёнавіч, Аксёнаўна — Аксён

**Алаі́з** (*разм.* Алёйза, Альдзі́сь)

Алаі́завіч, Алаі́заўна—Алойзий

**Але́г**

Але́гавіч, Але́гаўна — Оле́г

**Але́сь,** *разм., гл.* Алякса́ндр

**Алёйза,** *разм., гл.* Алаі́з

**Алёкса,** *разм., гл.* Аляксе́й

**Аліго́р,** *разм., гл.* Гео́ргій

**Алізар,** *разм., гл.* Елізá́р

**Алі́мп**

Алі́мпавіч, Алі́мпаўна — Оли́мпий

**Алімпія́н**

Алімпія́навіч, Алімпія́наўна — Олимпиа́н

**Алісе́й,** *разм., гл.* Елісе́й

**Аліста́р,** *разм., гл.* Арыста́рх

**Аліхве́р**

Аліхве́равіч, Аліхве́раўна — Елевфе́рий

**Алфе́й**

Алфе́евіч, Алфе́еўна — А́лфе́й

**Алфёр**

Алфёравіч, Алфёраўна *і* **Алфе́рый,** Алфе́р'евіч, Алфе́р'еўна — Алфе́рий

**Алфе́рый,** *гл.* Алфёр

**Альбе́рт**

Альбе́ртавіч, Альбе́ртаўна — Альбе́рт

**Альбі́н**

Альбі́навіч, Альбі́наўна — Альби́н

**А́львія́н**

Альвія́навіч, Альвія́наўна — Альвиа́н

**Альге́рд**

Альге́рдавіч, Альге́рдаўна — Ольге́рд

**Альдзі́сь,** *разм., гл.* Алаі́з

**Альфо́нс** (*разм.* Альфу́к)

Альфо́нсавіч, Альфо́нсаўна — Альфо́нс

**Альфрэ́д** (*разм.* Фрэ́дусь)

Альфрэ́давіч, Альфрэ́даўна — Альфре́д

**Альфу́к,** *разм., гл.* Альфо́нс

**Алядо́р,** *разм., гл.* Іліядо́р

**Алякса́ндар,** *разм., гл.* Алякса́ндр

**Алякса́ндр** (*разм.* Алякса́ндар, Алякса́ндра, Але́сь, Аляхно́)

Аляксáндравіч, Аляксáндраўна — Алексáндр

**Аляксáндра**, *разм., гл.* Аляксáндр

**Аляксéй** (*разм.* Алёкса, Лёкса)
Аляксéевіч, Аляксéеўна — Алексéй

**Аляхнó**, *разм., гл.* Аляксáндр

**Амбражэ́й**, *разм., гл.* Амбрóс

**Амбрóжы**, *разм., гл.* Амбрóс

**Амбрóс** (*разм.* Амбрóжы, Амбражэ́й)
Амбрóсавіч, Амбрóсаўна *і* **Амбрóсій**, Амбрóсьевіч, Амбрóсьеўна — Амврóсий

**Амбрóсій**, *гл.* Амбрóс

**Амільяш**, *разм., гл.* Емяльян

**Амóс**
Амóсавіч, Амóсаўна — Амóс

**Амфілóхій** (*разм.* Хілóт)
Амфілóхіевіч, Амфілóхіеўна — Амфилóхий

**Амялля́н**, *разм., гл.* Емялья́н

**Анáній**, *гл.* Анáнь

**Анáнь** (*разм.* Нáнісь)
Анáневіч, Анáнеўна *і* **Анáній**, Анáньевіч, Анáньеўна— Анáний

**Анастáс** (*разм.* Настáс)
Анастáсавіч, Анастáсаўна *і* **Анастáсій**, Анастáсьевіч, Анастáсьеўна — Анастáс, Анастáсий

**Анастáсій**, *гл.* Анастáс

**Анатóлій**, *гл.* Анатóль

**Анатóль**
Анатóлевіч, Анатóлеўна *і* **Анатóлій**, Анатóльевіч, Анатóльеўна — Анатóлий

**Андрóн**
Андрóнавіч, Андрóнаўна — Андрóн

**Андрóнік**
Андрóнікавіч, Андрóнікаўна — Андрóник

**Андрóс**, *разм., гл.* Андрэ́й

**Андрýк**, *разм., гл.* Андрэ́й

**Андрýсь**, *разм., гл.* Андрэ́й

**Андрыя́н**
Андрыя́навіч, Андрыя́наўна — Андриáн

**Андрыя́ш**, *разм., гл.* Андрэ́й

**Андрэ́й** (*разм.* Андрóс, Андрýк, Андрýсь, Андрыя́ш)
Андрэ́евіч, Андрэ́еўна — Андрéй

**Анікéй**
Анікéевіч, Анікéеўна *і* **Анíкій**, Анíкіевіч, Анíкіеўна — Аникéй, Анúкий

**Анíкій**, *гл.* Анікéй

**Анíс**, *разм., гл.* Анíсім

**Анíсій** (*разм.* Анíсь)
Анíсьевіч, Анíсьеўна — Онúсий

**Анíсім** (*разм.* Анíс)
Анíсімавіч, Анíсімаўна — Анúсим

**Анíсь**, *разм., гл.* Анíсій

**Анія́н**

Aніянавіч, Аніянаўна — Oниáн

**Анóпрый**, *разм., гл.* Анýфрый

**Анóс**

Анóсавіч, Анóсаўна — Анóс

**Антанíн**

Антанíнавіч, Антанíнаўна — Антонúн

**Антóн** (*разм.* Антóсь)

Антóнавіч, Антóнаўна — Антóн

**Антóсь**, *разм., гл.* Антóн

**Антóх**, *разм., гл.* Анцівóх

**Анупрэ́й**, *разм., гл.* Анýфрый

**Анýфрый** (*разм.* Анухрэ́й, Анóпрый, Анупрэ́й, Нупрэ́й, Нухрэ́й)

Анýфрыевіч, Анýфрыеўна — Онýфрий

**Анухрэ́й**, *разм., гл.* Анýфрый

**Анфíл**

Анфíлавіч, Анфíлаўна — Анфúл

**Анфíм**

Анфíмавіч, Анфíмаўна — Анфúм

**Анцівóх** (*разм.* Антóх)

Анцівóхавіч, Анцівóхаўна — Антиóх

**Анцíм**, *разм., гл.* Анцімóн

**Анцімóн** (*разм.* Анцíм)

Анцімóнавіч, Анцімóнаўна — Антимóн

**Анцíп**

Анцíпавіч, Анцíпаўна — Антúп

**Апалінáр** (*разм.* Палінáр)

Апалінáравіч, Апалінáраўна *і* **Апалінáрый**, Апалінáр'евіч, Апалінáр'еўна — Аполлинáрий

**Апалінáрый**, *гл.* Апалінáр

**Апалóн**

Апалóнавіч, Апалóнаўна *і* **Апалóній**, Апалóньевіч, Апалóньеўна — Аполлóн, Аполлóний

**Апалóній**, *гл.* Апалóн

**Апанáс** (*разм.* Панáс)

Апанáсавіч, Апанáсаўна *і* **Афанáсій**, Афанáсьевіч, Афанáсьеўна — Афанáсий

**Апéнцій**

Апéнцьевіч, Апéнцьеўна — Апéнтий

**Апімáх**, *разм., гл.* Эпімáх

**Апіфáн**, *разм., гл.* Епіфáн

**Арафáл**, *разм., гл.* Рафаíл

**Ардальён**

Ардальёнавіч, Ардальёнаўна — Ардалиóн

**Аркáд**, *разм., гл.* Аркáдзь

**Аркáдзій**, *гл.* Аркáдзь

**Аркáдзь** (*разм.* Аркáд)

Аркáдзевіч, Аркáдзеўна *і* **Аркáдзій**, Аркáдзьевіч, Аркáдзьеўна — Аркáдий

**Арнóльд**

Арнóльдавіч, Арнóльдаўна — Арнóльд

**Арсайла**, *разм., гл.* Арсен
**Арсен** (*разм.* Арсён, Арсень, Арсайла)
Арсенавіч, Арсенаўна *і* **Арсеній**, Арсеньевіч, Арсеньеўна — Арсений, Арсентий
**Арсеній**, *гл.* Арсен
**Арсень**, *разм., гл.* Арсен
**Арсён**, *разм., гл.* Арсен
**Артамон**
Артамонавіч, Артамонаўна — Артамон
**Артук**, *разм., гл.* Артур
**Артур** (*разм.* Артусь, Артук)
Артуравіч, Артураўна — Артур
**Артусь**, *разм., гл.* Артур
**Архіп**
Архіпавіч, Архіпаўна — Архип
**Арцеміій**, *гл.* Арцём
**Арцём** (*разм.* Арцісь, Арцюх, Арцім)
Арцёмавіч, Арцёмаўна *і* **Арцемій**, Арцем'евіч, Арцем'еўна — Артемий, Артём
**Арцім**, *разм., гл.* Арцём
**Арцісь**, *разм., гл.* Арцём
**Арцюх**, *разм., гл.* Арцём
**Арцямон**
Арцямонавіч, Арцямонаўна — Артемон
**Арывон**
Арывонавіч, Арывонаўна — Орион
**Арыстарх** (*разм.* Алістар)
Арыстархавіч, Арыстархаўна — Аристарх
**Арысцід**
Арысцідавіч, Арысцідаўна— Аристид
**Арэнта**, *разм., гл.* Арэнцій
**Арэнцій** (*разм.* Арэнта, Арэнь)
Арэнцьевіч, Арэнцьеўна — Орентий
**Арэнь**, *разм., гл.* Арэнцій
**Арэст** (*разм.* Рэстусь)
Арэставіч, Арэстаўна — Орест
**Арэфа**, *разм., гл.* Арэфій
**Арэфій** (*разм.* Арэхва, Арэфа)
Арэф'евіч, Арэф'еўна — Арефий
**Арэхва**, *разм., гл.* Арэфій
**Асаф**, *разм., гл.* Іасаф
**Аскар**
Аскаравіч, Аскараўна — Оскар
**Аскольд**
Аскольдавіч, Аскольдаўна — Аскольд
**Асон** (*разм.* Ясон)
Асонавіч, Асонаўна—Иасон
**Астап** (*разм.* Асташ)
Астапавіч, Астапаўна — Остап
**Асташ**, *разм., гл.* Астап
**Асціфей**
Асціфеевіч, Асціфееўна — Астифей

**Атрóх**, *разм., гл.* Трафíм
**Аўгéй**, *разм., гл.* Яўгéн
**Аўгéн**, *разм., гл.* Яўгéн
**Аўгéнь**, *разм., гл.* Яўгéн
**Аўгія́ш**, *разм., гл.* Яўгéн
**Аўгра́п**, *разм., гл.* Яўгра́ф
**А́ўгуст**
А́ўгуставіч, А́ўгустаўна — А́вгуст
**Аўгусцíн**
Аўгусцíнавіч, Аўгусцíнаўна — Августи́н
**Аўдакíм**, *разм., гл.* Еўдакíм
**Аўдзéй** (*разм.* Аўдзія́ш)
Аўдзéевіч, Аўдзéеўна — Авдéй
**Аўдзія́ш**, *разм., гл.* Аўдзéй
**Аўдóсь**, *разм., гл.* Еўдакíм
**Аўдóт**, *разм., гл.* Еўдакíм
**Аўксéнцій** (*разм.* Акса́йла)
Аўксéнцьевіч, Аўксéнцьеўна — Авксéнтий
**Аўла́с**, *разм., гл.* Ула́с
**Аўлóх**, *разм., гл.* Яўлóгій
**Аўра́м**, *гл.* Абра́м
**Аўрэлія́н** (*разм.* Аўрэ́ль)
Аўрэлія́навіч, Аўрэлія́наўна — Аврелиа́н
**Аўрэ́ль**, *разм., гл.* Аўрэлія́н
**Аўсéй**, *разм., гл.* Яўсéй
**Аўстра́т**, *разм., гл.* Яўстра́т
**Аўсцігнéй**, *разм., гл.* Еўсцігнéй
**Аўту́х**, *разм., гл.* Яўціхій
**Аўхíм**, *разм., гл.* Яўхíм
**Афана́сій**, *гл.* Апана́с
**Афінагéн** (*разм.* Фінагéн)
Афінагéнавіч, Афінагéнаўна — Афиногéн
**Афóн**
Афóнавіч, Афóнаўна *і* **Афóній**, Афóньевіч, Афóньеўна — Афóн, Афóний
**Афóній**, *гл.* Афóн
**Афрыка́н**
Афрыка́навіч, Афрыка́наўна — Африка́н
**Ахрамéй**, *разм., гл.* Яфрэ́м
**Ахрэ́м**, *разм., гл.* Яфрэ́м

## Б

**Багда́н**
Багда́навіч, Багда́наўна — Богда́н
**Багумíл** (*разм.* Бóгуш, Бóгут)
Багумíлавіч, Багумíлаўна — Богуми́л
**Багусла́ў** (*разм.* Багу́сь, Бóгусь, Бóкша)
Багусла́вавіч, Багусла́ваўна — Богусла́в
**Багу́сь**, *разм., гл.* Багусла́ў
**Базы́ль**, *разм., гл.* Васíль
**Балтаза́р** (*разм.* Бальца́р, Вальцíсь)
Балтаза́равіч, Балтаза́раўна *і* **Балтаса́рый**, Балтаса́р'евіч, Балтаса́р'еўна — Балтаса́рий
**Балтаса́рый**, *гл.* Балтаза́р

**Бальца́р,** *разм., гл.* Балтаза́р

**Баляслá ў** (*разм.* Бо́лесь)
Баляслá вавіч, Баляслá ваўна — Болесла́в

**Банады́сь,** *разм., гл.* Венядзíкт

**Банá ш,** *разм., гл.* Венядзíкт

**Баніфá т** (*разм.* Баніхвá т, Ніхвá т)
Баніфá тавіч, Баніфá таўна *і* **Баніфá цый,** Баніфá цыевіч, Баніфá цыеўна—Бонифá тий, Вонифá тий

**Баніфá цый,** *гл.* Баніфá т

**Баніхвá т,** *разм., гл.* Баніфá т

**Банэ́дык,** *разм., гл.* Венядзíкт

**Баркулá б,** *разм., гл.* Варлá м

**Барлю́к,** *разм., гл.* Варлá м

**Барнá сь,** *разм., гл.* Бярнá дзій

**Барнá т,** *разм., гл.* Бярнá дзій

**Барталаме́й,** *разм., гл.* Варфаламе́й

**Барто́ш,** *разм., гл.* Варфаламе́й

**Бары́с**
Бары́савіч, Бары́саўна — Бори́с

**Барыслá ў**
Барыслá вавіч, Барыслá ваўна — Борислá в

**Басту́н,** *разм., гл.* Васія́н

**Басце́й,** *разм., гл.* Васія́н

**Баўтраме́й,** *разм., гл.* Варфаламе́й

**Баўтру́к,** *разм., гл.* Варфаламе́й

**Бахры́м,** *разм., гл.* Варфаламе́й

**Бенады́сь,** *разм., гл.* Венядзíкт

**Бенядзíкт,** *гл.* Венядзíкт

**Блажэ́й,** *разм., гл.* Улá с

**Бо́гусь,** *разм., гл.* Багуслá ў

**Бо́гут,** *разм., гл.* Багумíл

**Бо́гуш,** *разм., гл.* Багумíл

**Бо́кша,** *разм., гл.* Багуслá ў

**Бо́лесь,** *разм., гл.* Баляслá ў

**Браніслá ў** (*разм.* Бро́нісь, Бранюк)
Браніслá вавіч, Браніслá ваўна — Бронислá в

**Браню́к,** *разм., гл.* Браніслá ў

**Брачыслá ў**
Брачыслá вавіч, Брачыслá ваўна — Брячислá в

**Бро́нісь,** *разм., гл.* Бранíслаў

**Бу́дрыс,** *разм., гл.* Варфаламе́й

**Бутры́м,** *разм., гл.* Варфаламе́й

**Бэньямíн,** *разм., гл.* Веньямíн

**Бярнá дзій** (*разм.* Барнá т, Барнá сь)
Бярнá дзьевіч, Бярнá дзьеўна — Бернá дий

**Бярнá рд**
Бярнá рдавіч, Бярнá рдаўна — Бернá рд

## В

**Вавíла**
Вавíлавіч, Вавíлаўна — Вавíла

**Вадзі́м**
Вадзі́мавіч, Вадзі́маўна — Вади́м
**Вале́нта,** *разм., гл.* Вале́нцій
**Вале́нцій** (*разм.* Вале́нта)
Вале́нцьевіч, Вале́нцьеўна — Вале́нтий
**Вале́рый**
Вале́р'евіч, Вале́р'еўна — Вале́рий
**Вальдэма́р**
Вальдэма́равіч, Вальдэма́раўна — Вальдема́р
**Вальфры́д**
Вальфры́давіч, Вальфры́даўна — Вольфри́д
**Вальці́сь,** *разм., гл.* Балтаза́р
**Валю́к,** *разм., гл.* Валяр'я́н
**Валю́сь,** *разм., гл.* Валяр'я́н
**Валянці́н** (*разм.* Во́лесь)
Валянці́навіч, Валянці́наўна — Валенти́н
**Валяр'я́н** (*разм.* Валю́к, Валю́сь)
Валяр'я́навіч, Валяр'я́наўна — Валерья́н, Валериа́н
**Ваніфа́цый,** *гл.* Баніфа́т
**Варкала́б,** *разм., гл.* Варла́м
**Варлаа́м,** *гл.* Варла́м
**Варла́м** (*разм.* Варкала́б, Баркула́б, Барлю́к)
Варла́мавіч, Варла́маўна *і* **Варлаа́м,** Варлаа́мавіч, Варлаа́маўна — Варлаа́м, Варла́м

**Варла́мпій**
Варла́мпіевіч, Варла́мпіеўна — Варла́мпий
**Варфаламе́й** (*разм.* Вархаламе́й, Бартламе́й, Баўтраме́й, Бутры́м, Бахры́м, Барто́ш, Баўтру́к, Бу́дрыс)
Варфаламе́евіч, Варфаламе́еўна — Варфоломе́й
**Вархаламе́й,** *разм., гл.* Варфаламе́й
**Васі́лій,** *гл.* Васі́ль
**Васі́ль** (*разм.* Базы́ль)
Васі́левіч, Васі́леўна *і* **Васі́лій,** Васі́льевіч, Васі́льеўна — Васи́лий
**Васія́н** (*разм.* Басце́й, Басту́н)
Васія́навіч, Васія́наўна — Вассиа́н
**Вацла́ў**
Вацла́вавіч, Вацла́ваўна — Вацла́в
**Веньямі́н** (*разм.* Бэньямі́н)
Веньямі́навіч, Веньямі́наўна — Вениами́н
**Венядзі́кт** (*разм.* Банады́сь, Бенады́сь, Банэ́дык, Бана́ш)
Венядзі́ктавіч, Венядзі́ктаўна *і* **Бенядзі́кт,** Бенядзі́ктавіч, Бенядзі́ктаўна — Венеди́кт, Бенеди́кт
**Венядзі́м**
Венядзі́мавіч, Венядзі́маўна — Венеди́м
**Ераме́й,** *разм., гл.* Ераме́й

**Ві́кенцій** (*разм.* Вінцэ́сь, Вінцу́к, Ві́нцусь)
Віке́нцьевіч, Віке́нцьеўна *і* **Вінцэ́нт,** Вінцэ́нтавіч, Вінцэ́нтаўна — Вике́нтий

**Ві́ктар** (*разм.* Ві́ктусь)
Ві́ктаравіч, Ві́ктараўна — Ви́ктор

**Ві́ктусь,** *разм., гл.* Ві́ктар

**Віле́н**
Віле́навіч, Віле́наўна — Виле́н

**Віло́рый**
Віло́р'евіч, Віло́р'еўна—Вило́рий

**Вільге́льм**
Вільге́льмавіч, Вільге́льмаўна — Вильге́льм

**Вільямі́р**
Вільямі́равіч, Вільямі́раўна — Вильями́р

**Віна́лій**
Віна́льевіч, Віна́льеўна — Вина́лий

**Віну́сь,** *разм., гл.* Авянір

**Вінцу́к,** *разм., гл.* Віке́нцій

**Ві́нцусь,** *разм., гл.* Віке́нцій

**Вінцэ́нт,** *гл.* Віке́нцій

**Вінцэ́сь,** *разм., гл.* Віке́нцій

**Вісарыён**
Вісарыёнавіч, Вісарыёнаўна — Виссарио́н

**Віта́лій**
Віта́льевіч, Віта́льеўна—Вита́лий

**Віто́льд**
Віто́льдавіч, Віто́льдаўна — Вито́льд

**Во́йцех**
Во́йцехавіч, Во́йцехаўна— Во́йтех

**Во́кум,** *разм., гл.* Абаку́м

**Во́лесь,** *разм., гл.* Валянцін

**Во́сіп,** *разм., гл.* Ió́сіф

**Вулля́н,** *разм., гл.* Улья́н

**Вяргі́ній**
Вяргі́ньевіч, Вяргі́ньеўна — Верги́ний

**Вячасла́ў**
Вячасла́вавіч, Вячасла́ваўна — Вячесла́в

## Г

**Габру́сь,** *разм., гл.* Габрыéль

**Габрые́ль** (*разм.* Габру́сь)
Габрые́левіч, Габрые́леўна — Габрие́ль

**Галакціён** (*разм.* Лакціён)
Галакціёнавіч, Галакціёнаўна — Галактио́н

**Галья́ш,** *разм., гл.* Ілья́

**Гапе́й**
Гапе́евіч, Гапе́еўна — Гапе́й

**Гапія́н,** *разм., гл.* Агафо́н

**Гапо́н,** *разм., гл.* Агафо́н

**Гапу́сь,** *разм., гл.* Агафо́н

**Гара́льд,** *разм., гл.* Гера́льд

**Гара́с,** *разм., гл.* Гера́сім

**Гара́сім,** *разм., гл.* Гера́сім

**Гара́сь,** *разм., гл.* Гера́сім

**Гардзе́й**

Гардзе́евіч, Гардзе́еўна — Горде́й

**Га́спар**

Га́спаравіч, Га́спараўна— Га́спор

**Гаўру́к,** *разм., гл.* Гаўры́ла

**Гаўру́сь,** *разм., гл.* Гаўры́ла

**Гаўрыі́л,** *гл.* Гаўры́ла

**Гаўры́ла** (*разм.* Гаўру́к, Гаўру́сь)

Гаўры́лавіч, Гаўры́лаўна *і* **Гаўрыі́л,** Гаўрыі́лавіч, Гаўрыі́лаўна — Гаври́ил

**Гвідо́н**

Гвідо́навіч, Гвідо́наўна— Гвидо́н

**Гедэо́н** (*разм.* Гідо́н)

Гедэо́навіч, Гедэо́наўна — Гедео́н

**Гела́сій**

Гела́сьевіч, Гела́сьеўна— Гела́сий

**Гемі́н,** *разм., гл.* Гемінія́н

**Гемінія́н** (*разм.* Гемі́н)

Гемінія́навіч, Гемінія́наўна — Геминиа́н

**Гена́дзій,** *гл.* Гена́дзь

**Гена́дзь** (*разм.* Ге́нусь)

Гена́дзевіч, Гена́дзеўна *і* **Гена́дзій,** Гена́дзьевіч, Гена́дзьеўна — Генна́дий

**Ге́нрых**

Ге́нрыхавіч, Ге́нрыхаўна — Ге́нрих

**Ге́нусь,** *разм., гл.* Гена́дзь

**Гео́ргій** (*разм.* Алігóр)

Гео́ргіевіч, Гео́ргіеўна — Гео́ргий

**Герадо́т**

Герадо́тавіч, Герадо́таўна — Геродо́т

**Гера́клій**

Гера́кліевіч, Гера́клієўна — Гера́клий

**Гера́льд** (*разм.* Гара́льд)

Гера́льдавіч, Гера́льдаўна— Гера́льд

**Гераніі́м** (*разм.* Гіру́сь)

Герані́мавіч, Герані́маўна — Герони́м

**Гера́рд**

Гера́рдавіч, Гера́рдаўна— Гера́рд

**Гера́сім** (*разм.* Гара́сім, Гра́сім, Гара́сь, Гара́с)

Гера́сімавіч, Гера́сімаўна — Гера́сим

**Герва́сій** (*разм.* Гра́ўша)

Герва́сьевіч, Герва́сьеўна — Герва́сий

**Гермаге́н**

Гермаге́навіч, Гермаге́наўна — Гермоге́н

**Ге́рман**

Ге́рманавіч, Ге́рманаўна— Ге́рман

**Геро́нцій** (*разм.* Ранці́сь)

Геро́нцьевіч, Геро́нцьеўна — Геро́нтий

**Гідо́н,** *разм., гл.* Гедэо́н

**Гіля́рый**

Гіля́рыевіч, Гіля́рыеўна — Гиля́рий

**Гіпаліт,** *разм., гл.* Іпаліт

**Гіру́сь,** *разм., гл.* Геранім

**Гіяцы́нт**

Гіяцы́нтавіч, Гіяцы́нтаўна — Гиаци́нт

**Глеб**

Гле́бавіч, Гле́баўна — Глеб

**Гліке́рый**

Гліке́р'евіч, Гліке́р'еўна — Глике́рий

**Грасім,** *разм., гл.* Гера́сім

**Гра́ўша,** *разм., гл.* Герва́сій

**Грацыя́н**

Грацыя́навіч, Грацыя́наўна — Грациа́н

**Графу́л,** *разм., гл.* Яўгра́ф

**Гры́галь,** *разм., гл.* Рыго́р

**Грыго́р,** *разм., гл.* Рыго́р

**Грынь,** *разм., гл.* Рыго́р

**Гу́берт**

Гу́бертавіч, Гу́бертаўна — Гу́берт

**Гур,** *разм., гл.* Гу́рый

**Гу́рый** (*разм.* Гур)

Гу́р'евіч, Гу́р'еўна — Гу́рий

**Гу́ста,** *разм., гл.* Аўгусцін

**Густа́ў**

Густа́вавіч, Густа́ваўна — Густа́в

## Д

**Давы́д**

Давы́давіч, Давы́даўна — Дави́д, Давы́д

**Дама́н,** *разм., гл.* Дзям'ян

**Даме́цій**

Даме́цьевіч, Даме́цьеўна — Доме́тий

**Дамецыя́н** (*разм.* До́мант)

Дамецыя́навіч, Дамецыя́наўна — Дометиа́н

**Даміні́к**

Даміні́кавіч, Даміні́каўна — Домини́к

**Дана́т**

Дана́тавіч, Дана́таўна — Дона́т

**Дане́ль,** *разм., гл.* Даніла

**Даніл,** *гл.* Даніла

**Даніла** (*разм.* Дане́ль)

Данілавіч, Даніла́ўна *і* **Даніл,** Данілавіч, Даніла́ўна — Дании́л

**Дану́т,** *разм., гл.* Еўдакім

**Дарафе́й** (*разм.* Дарахве́й, До́раш, До́рах, Дараце́й)

Дарафе́евіч, Дарафе́еўна — Дорофе́й

**Дарахве́й,** *разм., гл.* Дарафе́й

**Дараце́й,** *разм., гл.* Дарафе́й

**Дарміdóнт**

Дарміdо́нтавіч, Дарміdо́нтаўна — Дормидо́нт

**Да́рый**
Да́рыевіч, Да́рыеўна — Да́рий
**Дасіфе́й**
Дасіфе́евіч, Дасіфе́еўна— Досифе́й
**Дзе́мех,** *разм., гл.* Дзяме́нцій
**Дзімі́трый,** *гл.* Дзмі́трый
**Дзіяге́н**
Дзіяге́навіч, Дзіяге́наўна — Диоге́н
**Дзіядо́р**
Дзіядо́равіч, Дзіядо́раўна— Диодо́р
**Дзмі́трый** (*разм.* Змітро́к, Змітру́к, Змі́цер, Мі́трый)
Дзмі́трыевіч, Дзмі́трыеўна— Дми́трий
**Дзяма́ш,** *разм., гл.* Дзям'я́н
**Дзяме́нцій** (*разм.* Дзе́мех)
Дзяме́нцьевіч, Дзяме́нцьеўна — Деме́нтий
**Дзямі́д**
Дзямі́давіч, Дзямі́даўна— Деми́д
**Дзямя́н,** *разм., гл.* Дзям'я́н
**Дзям'я́н** (*разм.* Дзямя́н, Дзяма́ш, Дама́н)
Дзям'я́навіч, Дзям'я́наўна — Демья́н
**Дзяні́с**
Дзяні́савіч, Дзяні́саўна — Дени́с
**До́мант,** *разм., гл.* Дамеція́н
**До́рах,** *разм., гл.* Дарафе́й
**До́раш,** *разм., гл.* Дарафе́й
**Дро́на,** *разм., гл.* Дрыме́нт
**Дрыме́нт** (*разм.* Дро́на)
Дрыме́нтавіч, Дрыме́нтаўна — Дриме́нт

## Е

**Елеаза́р,** *гл.* Еліза́р
**Еліза́р** (*разм.* Аліза́р)
Еліза́равіч, Еліза́раўна — Елиза́р, Елеаза́р
**Елісе́й** (разм. Алісе́й)
Елісе́евіч, Елісе́еўна — Елисе́й
**Елістра́т**
Елістра́тавіч, Елістра́таўна — Елистра́т
**Емялья́н** (*разм.* Амялля́н, Амілья́ш, Мі́ля́н, Мілля́н)
Емялья́навіч, Емялья́наўна — Емелья́н
**Епіма́х,** *гл.* Эпіма́х
**Епіфа́н** (*разм.* Апіфа́н, Піхва́н)
Епіфа́навіч, Епіфа́наўна — Епифа́н, Епифа́ний
**Ераме́й** (*разм.* Вераме́й, Яро́м)
Ераме́евіч, Ераме́еўна — Ереме́й
**Ерані́м**
Ерані́мавіч, Ерані́маўна — Иерони́м
**Ерафе́й** (*разм.* Яра́ш, Яро́ш, Яру́сь, Яро́ха, Рахве́й, Рахце́й)

Ерафе́евіч, Ерафе́еўна — Ерофе́й

**Ермаге́н**

Ермаге́навіч, Ермаге́наўна — Ермоге́н

**Ермала́й** (*разм.* Ярма́к, Ярмо́ш, Ярмо́л)

Ермала́евіч, Ермала́еўна — Ермола́й

**Е́сіп,** *разм., гл.* Іо́сіф

**Еўдакі́м** (*разм.* Аўдакі́м, Аўдо́т, Аўдо́сь, Дану́т)

Еўдакі́мавіч, Еўдакі́маўна— Евдоки́м

**Еўсцігне́й** (*разм.* Аўсцігне́й)

Еўсцігне́евіч, Еўсцігне́еўна — Евстигне́й

**Ёсіп,** *разм., гл.* Іо́сіф

**Ёска,** *разм., гл.* Іо́сіф

## Ж

**Жэра́рд,** *гл.* Гера́рд

## З

**За́сім** (*разм.* Засьцём)

За́сімавіч, За́сімаўна — Зоси́ма

**Засьцём,** *разм., гл.* За́сім

**Заха́р** (*разм.* Заха́ра)

Заха́равіч, Заха́раўна *і* **Заха́рый,** Заха́р'евіч, Заха́р'еўна — Заха́рий

**Заха́ра,** *разм., гл.* Заха́р

**Заха́рый,** *гл.* Заха́р

**Збі́гнеў**

Збі́гневіч, Збі́гнеўна — Зби́гнев

**Збысла́ў** (*разм.* Збысь, Збы́шак)

Збысла́вавіч, Збысла́ваўна — Збысла́в

**Збысь,** *разм., гл.* Збысла́ў

**Збы́шак,** *разм., гл.* Збысла́ў

**Здзісла́ў** (*разм.* Здзісь)

Здзісла́вавіч, Здзісла́ваўна — Здисла́в

**Здзісь,** *разм., гл.* Здзісла́ў

**Зігмунд**

Зігмундавіч, Зігмундаўна — Зи́гмунд

**Зігфрыд** (*разм.* Зыфру́к)

Зігфрыдавіч, Зігфрыдаўна — Зи́гфрид

**Зіно́вій** (*разм.* Зінь)

Зіно́ўевіч, Зіно́ўеўна — Зино́вий

**Зінь,** *разм., гл.* Зіно́вій

**Зміро́к,** *разм., гл.* Дзмі́трый

**Змітру́к,** *разм., гл.* Дзмі́трый

**Зміцер,** *разм., гл.* Дзмі́трый

**Зот**

Зо́тавіч, Зо́таўна — Зот

**Зы́гмусь,** *разм., гл.* Сігізму́нд

**Зыфру́к,** *разм., гл.* Зігфрыд

**Зянко́,** *разм., гл.* Зяно́н

**Зяно́н** (*разм.* Зянко́)

Зяно́навіч, Зяно́наўна — Зено́н

# І

**Іакі́нф,** *гл.* Акі́нф

**Іаса́ф** (*разм.* Аса́ф)
Іаса́фавіч, Іаса́фаўна — Иоса́ф

**Іасо́н,** *гл.* Асо́н

**Іва́н** (*разм.* Ян, Ясь, Я́нка, Яну́к, Іва́сь, Я́нуш)
Іва́навіч, Іва́наўна — Ива́н

**Іва́сь,** *разм., гл.* Іва́н

**Іве́нцій**
Іве́нцьевіч, Іве́нцьеўна — Иве́нтий

**І́гар**
